ДУК "Лёзненская ЦБС"
Цэнтральная раённая бібліятэка



# Васіль Быкаў: талент мужны, непаўторны

Да 95-годдзя з дня нараджэння

2019

**Васіль Быкаў: талент мужны, непаўторны**: [інфармацыйны бібліяграфічны спіс літаратуры] / ДУК «Лёзненская ЦБС», Цэнтральная раённая бібліятэка; [склад. А.С. Кажэрава]. – Лёзна, 2019. – 10 с. – (Чытаем беларускую).

Няма сумненняў, што ў гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя Васіль Быкаў займае адно з пачэсных і значных месцаў. Розным аспектам жыцця і творчасці пісьменніка прысвечана шмат літаратуразнаўчых прац і успамінаў.

У спіс літаратуры, прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння Васіля Быкава, ўвайшлі крытычныя матэрыялы, шэраг кніг, брашур, артыкулаў аб яго жыцці і творчасці, а таксама асобныя яго творы.

*Ты не памёр. Вечна жывы.*
*Ісці ў страі салдацкім будзеш.*
*Ніколі, друг мой баявы,*
*Цябе планета не забудзе.*
*Вышэй узнімеш крыж святы.*
*І хай ярчэй заззяе.*
*З такімі воямі, як ты,*
*Радзіма ростані не знае.*

*Пятро Прыходзька*

Творы беларусскага пісьменніка Васіля Быкава чытаў, чытае і будзе чытаць увесь свет – свет сучасны: цывілізаваны і праведны, дзе ведаюць, цэняць і адстойваюць самыя галоўныя чалавечыя каштоўнасці. А вось цаніць такіх людзей, шанаваць і ганарыцца імі, нас навучыў Васіль Быкаў. І мы павінны шчыра дзякаваць нашай беларускай зямлі, што ен у нас есць.

Васіль Уладзіміравіч Быкаў нарадзіўся 19 чэрвеня 1924 года ў весцы Бычкі Ушацкага раена Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і. Экстэрнам скончыў сярэднюю школу. У 1939 годзе ен паступіў ў Віцебскае мастацкае вучылішча, але быў вымушаны пакінуць гэтую навучальную ўстанову і пайшоў вучыцца ў школу будаўнікоў.

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны Быкаў трапіў на фронт, а ўжо ў 1943-м 19-гадовы юнак камандаваў узводам. Баі на 2-м і 3-м Украінскіх франтах, два раненні, баявыя дзеянні на тэрыторыі Румыніі, Венгрыі, Югаславіі, Аўстрыі – гэта не проста штрыхі, а самыя сапраўдныя старонкі мужнай, небяспечнай і такой шматпакутнай біяграфіі Васіля Быкава. Ёсць у ей, дарэчы, і такі, неверагодна «нечаканы» і проста страшэнны, радок: у 1944-м родныя атрымалі на яго пахаванку, аднак, на шчасце, у тым баі на Луганшчыне ен выжыў...

Пасля заканчэння вайны Васіль Быкаў яшчэ два гады служыў у войску – на Украіне, у Беларусі і на Далекім Усходзе. Менавіта тады канчаткова і загартавалася ў Васіля Уладзіміравіча, як у пісьменніка, такая блізкая і зразумелая яму, прапушчаная праз уласнае сэрца, вайсковая тэматыка...

Дэмабілізаваўся ў 1947 годзе і прыехаў у Гродна, дзе працаваў мастаком, а пасля журналістам рэдакцыі газеты «Гродзенская праўда». У гэты час Васіль Быкаў пачаў шмат друкавацца.

Дэбютаваў некалькімі апавяданнямі, а пазней – аповесцю «Апошні баец». Васіль Быкаў у 1959 годзе апублікаваў аповесць «Жураўліны крык». Яна і стала сапраўдным выпрабаваннем таленту пісьменніка, праклала маладому творцу дарогу да вышынь літаратурнай славы і прызнання. Даследчыкі адразу ж адзначылі ў творы праўду жыцця і шчымлівы лірызм, што, несумненна, «спалучыць», «з'яднаць» у мастацкай творчасці дадзена далека не кожнаму... «Жураўліны крык» стаў адным з першых у беларускай літаратуры сумленных твораў пра трагедыю чалавека на вайне. Таму пасля выхаду ў свет аповесць і паставілі ў адну шарэнгу з такімі творамі ваеннай прозы, як «Жывыя і мѐртвыя» Канстанціна Сіманава, «Пядзя зямлі» Рыгора Бакланава, «Батальѐны просяць агню» Юрыя Бондарава, «Чалавек і зброя» Алеся Ганчара, «Агонь і снег» Івана Шамякіна...

«Гарызонты мастацкага ўзнаўлення» пашыраліся і паглыбляліся літаральна кожны год. «Здрада» і «Трэцяя ракета», «Пастка» і «Альпійская балада», «Мѐртвым не баліць» і «Круглянскі мост», «Праклятая вышыня» і «Сотнікаў», «Абеліск» і «Дажыць да світання», «Воўчая зграя» і «Яго батальен», «Пайсці і не вярнуцца» і «Знак бяды», «Кар'ер» і «У тумане», «Аблава» і «Сцюжа», «Ваўчыная яма» і «Афганец» –

што ні твор, то залатая старонка суровай і жорсткай, бескампраміснай і часцяком супярэчлівай, вайсковай і партызанскай рэчаіснасці часоў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ваенных канфліктаў наступных, 80-х гадоў; наогул – супрацьстаяння чалавечых нораваў, паводзін, характараў у экстрэмальных сітуацыях і выпадках...

Жывучы ў Гродне, пісьменнік шмат ездзіў па СССР, краінах Захаду. У яго з'яўляецца ўсе болей аднадумцаў і прыхільнікаў сярод калег і чытачоў. У Гродне ен узначальвае Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1978 годзе Васіль Быкаў пераязджае ў Мінск. У канцы 90-х гадоў ен пакідае радзіму і выязджае на Захад. Жыве ў Фінляндыі, Германіі, Чэхіі.

Кнігі апошняга часу – зборнік «Сьцяна», «Пахаджане. Прыпавесьці» – вызначаюцца глыбокім трагізмам успрымання жыцця. Апошняя прыжыццевая кніга – «Доўгая дарога да дому» – мемуары. Яны цікавыя не толькі фактамі, але і іх асэнсаваннем, ацэнкамі, зробленымі з далечыні гадоў. Перад намі – эпапея чалавечага лёсу на крутых паваротах XX стагоддзя. Васіль Быкаў дае сваімі ўспамінамі вельмі важныя ўрокі жыцця. У канцы кнігі – нават своеасаблівы маральна-патрыятычны запавет, звернуты да сучаснікаў і нашчадкаў. Гэта нібызавяршэнне яго багатай публіцыстыкі.

Цяжка захварэўшы, Васіль Быкаў пакідае Чэхію і прыязджае ў Мінск, каб апошні раз дакрануцца да роднай зямлі.

Памер Васіль Уладзіміравіч Быкаў 22 чэрвеня 2003 года – у дзень чарговай гадавіны пачатку Вялікай Айчыннай вайны. І ў гэтым было штосьці трагічна-сімвалічнае... Лёс?! Замова Усявышняга?!..

Яго творы – нягледзячы на неадназначнасць «высноў» і «вывадаў» партыйна-бюракратычных ацэншчыкаў і

«крытыкаў», даносы і заклады «добразычліўцаў», – усе ж такі па вартасцях былі ўганараваны ўладай. Васіль Быкаў – народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўных прэмій СССР і Беларусі. Шмат разоў беларускі народ выбіраў яго дэпутатам Вярхоўных Саветаў СССР і БССР, быў ен і народным дэпутатам СССР.

## Аб жыцці і творчасці пісьменніка


1. Адамовіч, Г. Васіль Быкаў – вялікае сэрца народа / Г. Адамовіч // Роднае слова. – 2013. – № 6. – С. 3-5.
2. Андраюк, С. Біяграфія творцы ў кантэксце часу / С. Андраюк// Полымя. – 2009. – № 6. – С. 143 - 153.
3. Бугаёў, Д.Я. Вывучэнне творчасці Васіля Быкава ў школе: дапаможнік для настаўнікаў / Д.Я. Бугаёў, М.У. Верціхоўская, В.У. Верціхоўская. – Мінск: Аверсэв, 2005.– 284 с.
4. Быкаў Васіль // Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік: у 6 т. / [рэдкал: І.Э. Багдановіч і інш.]. – Мінск, 1992. – Т. 1. – С. 426-444.
5. Васіль Быкаў // Беларускія пісьменнікі (1917-1990): даведнік/ [склад. А.К. Гардзіцкі]. – Мінск, 1994. – С. 77-78.
6. Васіль Быкаў: вядомы і невядомы: літаратуразнаўчае эсэ, успаміны / [уклад. М. Мінзер]. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011. – 175 с.

7. Быкаў Васіль Уладзіміравіч // Беларуская мова: энцыклапедыя / Пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск, 1994. – С. 106-108.
8. Быкаў Васіль Уладзіміравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1996. – Т. 3. – С. 371.
9. Быкаў Васіль Уладзіміравіч // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. – Мінск, 2005. – Т. l. – С. 198-199.
10. Быкаў Васіль Уладзіміравіч // 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур = 250 people from Belarus in the dialogue of cultures / [рэд.: Т.Л. Пісарэнка, Л.У. Языковіч; пераклад на англійскую мову Л.М. Серады]. – Мінск, 2008. – С. 244-245.
11. Быкаў Васіль Уладзіміравіч // Культура Беларусі: энцыклапедыя. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 129-130.
12. Быкаў Васіль Уладзіміравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск, 1994. – Т. 2. – С. 142.
13. Быков Василь // Республика Беларусь: энциклопедия: [в 7 т.].– Минск, 2006. – Т. 2. – С. 567.
14. Дубашынскі, Р. Канцэпты прыпавесцей Васіля Быкава / Р. Дубашынскі // Полымя. – 2011. – № 6. – С. 90-99.
15. Клішэвіч, Н.С. Творчая спадчына В. Быкава як фактар беларускай духоўнай культуры / Н.С. Клішэвіч / Весці БДПУ: Серыя 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2013. – № 2. – С. 104-108.
16. Лявонава, Е. "Не адзінокі востраў...": Васіль Быкаў і сусветная літаратура / Е. Лявонава // Полымя. – 2005. – № 8.– С. 166-182.
17. Мельник, К. Вечные вопросы человеческого бытия: тема жизни и смерти в творчестве В.В. Быкова / К. Мельник // Неман. – 2011. – № 5. – С. 208-210.
18. Мяснікоў, А.Ф. Васіль Быкаў (1924-2003): талент мужны, непаўторны / Анатоль Мяснікоў // Сто асоб беларускай

гісторыі: гістарычныя партрэты / Анатоль Мяснікоў. – 2-е выданне. – Мінск, 2009. – С. 305-308.
19. Рашэтнікава, Н.Б. Васіль Уладзіміравіч Быкаў, 1924-2003/ Н.Б. Рашэтнікава // Беларуская літаратура XX стагоддзя: (біяграфіі, бібліяграфія, літаратурная крытыка): даведнік длястарэйшага школьнага ўзросту / [Д.Я. Бугаёў і іншыя]. – Мінск, 2008. – С. 203-219.
20. Сульянов, А. Василь Быков. Комбат. Писатель. Друг / Анатолий Сульянов // Неман. – 2008. – № 2. – С. 110-132.– № 3. – С. 137-159.
21. Тарасава, Т.М. Праблема выбару ў творах Васіля Быкава канца XX стагоддзя / Т.М. Тарасава // Весці БДПУ. Серыя 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2011. – № 4. – С. 47-50.
22. Тычко, Г.К. Свабода выбару паводле Васіля Быкава / Г.К. Тычко // Беларуская літаратура XIX-XX стагоддзяў: час і асобы / Г.К. Тычко; Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў. – Мінск, 2010. – С. 180-188.
23. Тычына, М.А. Васіль Быкаў / М.А. Тычына // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. / НАН Беларусі, Інстітут літаратуры імя Я. Купалы; [рэдкалегія: У.В. Гніламедаў і інш.; навуковы рэдактар: У.В. Гніламедаў, В.П. Жураўлеў]. – Мінск, 2001. – Т. 3. – С. 640-688.
24. Чергинец, Н.И. Отдушина, без которой трудно: [беседа с писателем Николаем Чергинцом] / Н. Чергинец, беседовал Алесь Вишневский // Беларуская думка. – 2007. – № 9. – С. 128-136.

# Творы Васіля Быкава


1. Быкаў, В. Збор твораў: у 6 т. / В. Быкаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1992.
2. Быкаў, В. Выбраныя творы: у 2 т. / В. Быкаў. – Мінск: Ураджай, 1996.
3. Быкаў, В. Аповесці. Апавяданні: [для старэйшага школьнага ўзросту] / В. Быкаў; [прадмова Д. Бугаева]. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2007. – 285 с. – (Бібліятэка школьніка).
4. Быкаў, В. Аповесці / В. Быкаў; [прадмова М. Тычыны]. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2009. – 622 с. – (Школьная бібліятэка).
5. Быков, В. Альпийская баллада: повести / В. Быков. –Москва: Эксмо, 2011. – 638 с. – (Русская классика).
6. Быкаў, В. Бліндаж / В. Быкаў. – Менск: Выдавец Віктар Хурсік, 2007. – 192 с. – (Бібліятэчка часопісу “Дзеяслоў”; Выпуск 2).
7. Быкаў, В. Дажыць да світання: аповесці / В. Быкаў. – Мінск: Юнацтва, 1990. – 494 с. – (Школьная бібліятэка).
8. Быкаў, В. Доўгая дарога да дому: кніга ўспамінаў / В. Быкаў.– Мінск: Кніга, 2004. – 544 с.
9. Быкаў, В. Знак бяды. Ваўчыная яма: аповесці: [для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / В. Быкаў; [прадмова М. Тычыны]. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2009. – 350 с. – (Школьная бібліятэка).
10. Быкаў, В. Кар’ер: раман / В. Быкаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987. – 300 с.
11. Быкаў, В. Круглянскі мост. Сотнікаў: аповесці: [для старэйшага школьнага ўзросту] / В. Быкаў; [прадмова М. Тычыны]. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2008. – 334 с.: партр. – (Бібліятэка школьніка).

12. Быкаў, В. Пакахай мяне, салдацік: аповесці, апавяданні / В. Быкаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2013. – 574 с.
13. Быков, В. Пойти и не вернуться: повести / В. Быков. – Москва: Эксмо, 2010. – 638 с.: портр. – (Русская классика).
14. Быков, В. Сотников: [повести] / В. Быков; [предисл. В. Курбатова]. – Москва: Эксмо, 2009. – 639 с.: портр. – (Русская классика).
15. Быкаў, В. Сцюжа: аповесць / В. Быкаў. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. – 176 с.
16. Быкаў, В. У тумане: аповесці, раман / В. Быкаў. – Мінск: Юнацтва, 1995. – 464 с.

Васіль Быкаў: талент мужны, непаўторны

Інфармацыйны бібліяграфічны спіс літаратуры

Складальнік А.С. Кажэрава

211220, г.п. Лёзна, вул. Леніна, д. 65
Тэлефон: 5-17-67
E-mail: Libliozno@rambler.ru
Web-сайт: http://lioznolib.ucoz.ru

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Цэнтральная раённая бібліятэка


Я - беларус,
мая родная мова - беларуская.
Васіль Быкаў